## *Ukraina Lithuanica. Студії з історії Великого князівства Литовського*, т. 1, Київ, Інститут історії України НАН Украіны, 2009, 224 с.

Заўсёды верыў, што менавіта Украіна найлепшы прыклад для беларускага грамадства і звычайнага беларуса. Дастаткова зайсці на сайты Інстытута гісторыі НАН Украіны (www.history.org.ua) і Інстытута гісторыі НАН Беларусі (калі ён існуе), каб зразумець розніцу, а папраўдзе прорву паміж функцыянаваннем і вынікамі дзейнасці дзвюх падобных па статусе ўстаноў. Пра ўкраінскую гістарычную навуку гаворым як пра частку культуры, пра беларускую акадэмічную (ды універсітэцкую) гістарычную навуку гаворым як пра ідэалагічны дадатак. Ніяк няздольныя мы зразумець (а можа не жадаем, альбо не дазваляюць), што канструяванне мінуўшчыны — вельмі важны і неабходны элемент культуры: і нацыянальнай, і агульначалавечай. Менавіта ад якасці і трываласці канструкцый гістарычнай культуры залежаць этыка і эстэтыка чалавечых адносін унутры грамадства, а таксама вонкавыя рэакцыі.

Новы акадэмічны праект ***Ukraina Lithuanica*** можна было прадбачыць, гледзячы на актыўнасць, выніковую творчасць і салідарнасць украінскіх гісторыкаў у пытаннях Вялікага Княства Літоўскага за апошнія 20 год. Фелікс Шабульдо, Наталія Якавенка, Аляксей Талочка, Аксана Русіна, Наталія Старчанка, Пятро Кулакоўскі, маладзейшыя — Дзмітро Вашчук, Андрэй Блануца, Уладзімір Палішчук і іншыя, не проста вывучалі архівы і бібліятэкі па літуаністычнай тэматыцы, яны вывучаюць ролю і месца ўкраінскай гісторыі ў дадзеным дыскурсе. Праз свае ўнутраныя дыскусіі, праз тэксты, памылкі і дасягненні ўкраінскія калегі ў мінулым 2009 г. сцвердзілі — украінская нацыянальная школа вывучэння Вялікага Княства Літоўскага канчаткова сфармавалася. Афармленне навуковай школы альбо накірунку заўсёды матэрыялізуецца ў адпаведным выдаўнічым праекце. ***Ukraina Lithuanica*** якраз і з’яўляецца яскравым прыкладам вышэй гаворанага. Гэта потым па якасці друкаваных матэрыялаў і прапанаваных дыскусій, па стабільнасці і аб’ёмах выдання можна ацэньваць пазітыўныя і негатыўныя бакі рэалізаванага. Напрошваецца параўнанне з айчыннай беларускай сітуацый. Непараўнальнае яно. Тое, што з’яўляецца святым абавязкам акадэмічнага Інстытута гісторыі НАН Беларусі — аб’ядноўваць даследчыкаў нават з рознымі метадалагічнымі і палітычнымі поглядамі, ствараць і рэалізоўваць выдавецкія перыядычныя праекты, не выконваецца. Гэтая ўстанова з’яўляецца „ахоўным сабакам” на дарозе прагрэсу гуманітарнай навукі. Сапраўдная „рэч сама ў сабе”, але з пыхай і прэтэнзіямі на ўсёведаючых і самых геніяльных. А самае непрыемнае тое, што вялікая колькасць дзяржаўных і, не толькі, грошай выдадткоўва-

ецца на пустыя і часта аднадзённыя праекты. Таму мусім канстатаваць, што гонар беларускай гістарычнай навукі падтрымліваюць не дзякуючы, а наперакор акадэмічнаму інстытуту такія вось навуковыя ініцыятывы: „Беларускі гістарычны агляд" (рэд. Генадзь Сагановіч), „ARCHE-Пачатак" (рэд. Валеры Булгакаў), „Homo Historicus" (рэд. Алесь Смалянчук), „Час і асоба" (рэд. Аляксандр Фядута), „Гістарычны альманах" (рэд. Алесь Краўцэвіч), „Metricana" (рэд. Алег Дзярновіч) і „Białoruskie Zeszyty Historyczne" (рэд. Яўген Мірановіч).

Сапраўднымі натхняльнікамі і маторамі новага ўкраінскага праекта ***Ukraina Lithuanica*** з'яўляюцца Андрэй Блануца, Дзмітро Вашчук і Ларыса Жарабцова на чале з вядомым гісторыкам і нумізматам Міколай Катлярам. Яны склалі рэдакцыйную калегію. Не менш аўтарытэтная і прафесійная рэдакцыйная рада зборніка, на чале з дырэктарам Інстытута гісторыі НАН Украіны Валерыем Смоліей. У яе міжнародны склад ўвайшлі даследчыкі Украіны (Генадзі Борак, Олександр Гуржый, Пятро Сас, Валерый Сцепанкоў, Тарас Чухліб), Польшчы (Анджэй Закшэўскі, Генрык Люлевіч), Нямеччыны (Маціяс Ніендорф), Літвы (Рымвідас Петраўскас) і Беларусі (Васіль Варонін і Алег Дзярновіч). Да сваіх айчынных калегаў хочацца звярнуцца з просьбай (а можа прэтэнзіяй) ці неварта Вам інфармаваць актыўней беларускую навуковую супольнасць аб праекце, у якім вы ўдзельнічаеце.

Ініцыятыва асобнага выдання, прысвечанага вывучэнню і публікаванню матэрыялаў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, зыходзіць з аддзела гісторыі Украіны сярэдніх вякоў і ранняга новага часу Інстытута гісторыі Украіны НАН Украіны. Першачарговую задачу рэдакцыйная калегія бачыць у пашырэнні ўкраіназнаўчых штудый, публікацый дакументаў і корпусу архіўных крыніц. Аднак ініцыятары не ўяўляюць сабе дадзенага праекта без даследаванняў падзей, з'яў і тэрыторый, якія непасрэдна не звязаны з сёняшняй Украінай. Падобны кампаратывісцкі падыход — сведчанне сталасці адказных за зборнік асоб. Большасць тэкстаў першага нумару рэцэнзаванага часопіса склалі матэрыялы ўдзельнікаў міжнароднай канферэнцыі „Украіна і Вялікае Княства Літоўскае ў XIV-XVIII стст.: палітычныя, эканамічныя, міжнацыянальныя ды сацыякультурныя адносіны ў агульнаеўрапейскім вымярэнні" (Камянец-Падольскі, 25-27 верасня 2007 г.). Як вынікае з уступнага слова Рэдакцыйнай калегіі, гэта была першая канферэнцыя на Украіне, прысвечаная ВКЛ.

Першы том новага часопіса ***Ukraina Lithuanica*** структурна падзяляецца на „штудыі", „гістарыяграфічныя росшукі", „рэцэнзіі і агляды". У раздзеле „Штудыі" вылучаюцца два падраздзелы — „Палітыка і права" і „Сацыяльна-эканамічныя адносіны". Паспрабуем у сціслым выглядзе прадставіць сутнасць і высновы запрапанаваных у рэцэнзаваным

часопісе тэкстаў. Пры гэтым мы палічылі неабходным пакінуць у арыгінале назвы артыкулаў, абеларусіўшы імёны і прозвішчы аўтараў.

Першы падраздзел „Палітыка і права" пачынаецца тэкстам Андрэя Гурбыка (Кіеў): *Трактування „судових околиць" громадьскому судочинстві на українських землях Великого Князивства Литовського.* Аўтар звярнуўся да важнай, але складанай тэмы. Вядома, што ў сярэднявеччы на тэрыторыі Усходняй Еўропы (ад часоў „Рускай Праўды") у народнай правасвядомасці дамінавала ўяўленне пра грамадоўскія (копныя) суды як усеўладны судовы орган у вырашэнні практычна ўсіх бакоў сялянскага жыцця ад злачынстваў і зладзействаў (крадзяжы, пераахоўванне скрадзенага, забойствы і пашкоджанні) да цывільнапраўных (спадчыныя справы, сямейныя канфлікты, размежаванні зямель). Працягваючы традыцыі ўкраінскай гістарыяграфіі ў дадзеным пытанні, А. Губрык паглыбляе нашыя ўяўленні пра месцы збору копнага суда, пра межы „судовай ваколіцы", склад, функцыі і кампетэнцыі „копы". Таксама падрабязна аналізуе ролю „людзей староннiх", магнатаў, шляхты і вяліканяжацкіхураднікаў у абвяшчэнні, правядзенні і выніках грамадоўскіх судоў. Важны і маладаследаванны аспект „копных" судоў — гэта значэнне і адбітак судоў у псіхалогіі і ментальнасці сялян ВКЛ познесярэднявечнага часу. Пазітыўным момантам артыкула трэба лічыць выкарыстоўванне беларускага матэрыялу. Да канца XVI ст. і пазней, штодзённае жыццё сялян Украіны і Беларусі было тыпалагічна амаль ідэнтычным. Таму пры даследаванні гісторыі сялян абмяжоўвацца толькі тэрыторыямі сучасных дзяржаў метадалагічна памылкова. Дадзены артыкул шмат у чым дапаўняе вынікі апошніх даследаванняў Валянціна Голубева на беларускім матэрыяле[1].

Дзмітро Вашчук (Кіеў) у сваім артыкуле *Дотримання та використання інституту „старини" у Великому Князівстви Литовському в достатутовий період (на прикладі земської служби)* працягвае развіваць крытычны падыход у гістарыяграфіі да кансерватыўнай нормы грамадскага жыцця ў ВКЛ „старыны не рухаемо, а новіны не вводімо"[2], якая даволі часта вельмі адназначна канстатавалася як нейкая спе-

[1] В. Ф. Голубеў, *Сельская абшчына ў Беларусі XVI-XVIII стст.*, Мінск 2008, с. 74-89.

[2] М. Кром, *«Старина» как категория средневекового менталитета (по материалам Великого княжества Литовского XIV — нач. XVII вв.)*, [у:] *Mediavalia Ucrainica: ментальність та історія ідей*, Київ 1994, т. III, с. 68-85; А. Блануца, Д. Ващук, *Інститут „старини" й „новини" в правових та економічніх джерелах Великого князівства Литовського (друга половина XV-XVI ст.)*, „Український історичний журнал", 2006, № 2, с. 11-23; Д. Ващук, *Непорушність «старини»: «консерватизм» державної політики Великого князівства Литовського чи історіографічна традиція кінця XIX — першої третини XX ст.?* [у:] *Україна в Центрально-Східній Європі (з найдавніших часів до кінця XVIII ст.)*, вип. 6, Київ 2006, с. 423-438.

цыфічная рыса ўзаемаадносін цэнтральнай улады з рускімі землямі. На падставе значнай колькасці звестак з актавых дакументаў аўтар прыходзіць да высновы, што цэнтральны ўрад ВКЛ маніпуляваў „прынцыпам кансерватызму” ў залежнасці ад дзяржаўнай неабходнасці ўжо з XV ст. Дзеля ўзмацнення баяздольнасці войска, шмат шляхты вызвалялася ад ранейшых абавязкаў „старыны” ўзамен за нясенне земскай службы. З іншага боку частка шляхты ўвогуле вызвалялася ад вайсковай службы, напрыклад „да жывата”. Тэма і высновы аўтара разбіваюць стэрэатып ранейшай гістарыяграфіі аб нейкім статычным, павольна змяняемым сацыяльным жыцці ВКЛ.

Айчынны бок прадставіў Алег Дзярновіч (Мінск) артыкулам *Берестейский повет до и после реформы 1565-1567 гг.: к истории административно-территориальных единиц в Великом Княжестве Литовском.* Тэкст беларускага даследчыка больш нагадвае аналітычнае падсумаванне па выніках даследаванняў папярэднікаў разумення некаторых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ВКЛ у XVI ст. („воласць”, „павет”), а таксама працэсаў фармавання адміністрацыйных межаў на паўднёвым захадзе. Прыкладам для сваіх разважанняў аўтар абраў Берасцейскі павет, спецыфікай якога з’яўляецца памежнае становішча. Менавіта гэта доўгі час уплывала на адміністрацыйна-тэрытарыяльную нявызначанасць і размежаванне дадзенай тэрыторыі. Асобную ўвагу А. Дзярновіч надае таксама адміністратыўным сувязям паміж гістарычнай Берасцейшчынай і Падляшшам. Услед за Алінай Вавжыньчык і Даротай Міхалюк паказвае доўгі, складаны і часам драматычны працэс фармавання мяжы паміж Падляшскім ваяводствам Польскага Каралеўства і Берасцейскім ваяводствам ВКЛ. Мусім канстатаваць, што як папярэднікі, так і Алег Дзярновіч, не да канца вырашылі пытанні значэння этнічнага, рэлігійнага і сацыяльнага фактараў на сітуацыю.

Лірыя Сцепанавічэне (Вільня) у артыкуле *Некоторые особенности реализации норм залогового права (в первые годы действия второго литовского статута)* звярнулася да вывучэння рэальнага выкарыстоўвання аднаго з найважнешых прававаых механізмаў штодзённага жыцця шляхты ВКЛ. Норма „закладання маёмасці” з’яўлялася вельмі распаўсюджанай. Ёй карысталіся ўсе слаі шляхецкага асяроддзя ад магнатаў да ніжэйшых. Прычыны былі розныя, але пераважала неабходнасць мець сродкі на паўнавартаснае выкананне абавязковай вайсковай земскай службы. Літоўская даследчыца прааналізавала стан вывучэння норм залогавага (застаўнога) права ў Другім Літоўскім Статуце і іх рэалізацыі на практыцы, прыйшла да высновы, што ў літоўскай гістарыяграфіі яно роўнае нулю. Заўважым, што ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы, асабліва акадэмічнай, гісторыя права не існуе як від.

Галоўная выснова літоўскай даследчыцы: Другі Літоўскі Статут не ўнёс радыкальных змен у застаўное права ў параўнанні з папярэднім ад 1529 г. Аднак відавочна рэагуе на багацейшую прававую штодзённасць і казусы ў жыцці шляхецкага і мяшчанскага грамадства ВКЛ. Аляксандр Малаў (Масква) у сваім тэксце *Борьба за Невель в конце Смуты* даволі падрабязна на факталагічным матэрыяле ілюструе складаныя ваенна-палітычныя працэсы паўночна-ўсходняга памежжа ВКЛ у першай палове XVII ст. „Погляд" з Масквы дазваляе больш адэкватна ацаніць палітыку РП у гэтым накірунку і прадставіць падзеі. Тут мы маем сапраўды гераічнае супрацьстаянне невельцаў супроць войскаў ВКЛ, а таксама ўнутранную палітыку маскоўскага ўрада па захаванню дадзеных тэрыторый за сабой: эканамічна ў выглядзе аплат вайсковым людзям (праўда, не рэгулярна); вайскова — арганізацыя нападаў на памежныя крэпасці ВКЛ у 1613-1614 гг. — Ула, Асвея, Езерышча. З іншага боку даведваемся аб няўдалых спробах захопу Невеля літоўскім войскам у 1614 г. Зноў мусім прызнаць, што беларуская ды і літоўская нацыянальныя гістарыяграфіі вельмі мала надаюць увагі вывучэнню ўсходніх рэгіёнаў ВКЛ. Таму дасюль яны для нас пэўная terra incognita, пазабытыя старонкі мінулага. А гэта са свайго боку ўзмацняе „рэваншысцкія" нарацыі нашых расійскіх калегаў, між іншым А. Мілава. Падобнае адчуваецца ў некаторых выразах і тэрміналогіі: „польско-литовские интервенты", „московская «реконкиста» 1632-1634". І яшчэ, у артыкуле А. Малава год папісання Дэулінскага пагаднення падаецца 1619 г., а беларускія даследчыкі ў энцыклапедыі „Вялікае Княства Літоўскае" называюць дату 1 снежня 1618 г.[3] Чым выклікана розная храналогія?

Артыкул Валерыя Сцепанкова (Камянец-Падольскі) *Велике Князівство Литовське у політичніх планах Богдана Хмельницького (1648 — перша половина 1649 рр.)* асвятляе пэўныя моманты знешняй палітыкі Багдана Хмяльніцкага. Адзначым, што Хмяльніччына з'яўляецца мала вывучаным перыядам у беларускай гісторыі. Таму маем абсалютна два супрацьлеглыя погляды — ад ідэалагічнага нацыянальна-вызвольнага (пазітыўнага і прагрэсіўнага) да негатыўнага (захопніцкага і разбуральнага). Іншая сітуацыя ва ўкраінскай гістарыяграфіі, дзе постаць і дзейнасць Багдана Хмяльніцкага з'яўляецца знакавай у фармаванні сучаснай свядомасьці. Таму ў артыкуле В. Сцепанкова сустракаем дзіўныя для беларускага чытача тэрміны „ўкраінская рэвалюцыя" і „Багдан Вялікі". Аналіз не багатай крыніцазнаўчай базы дазволіў аўтару зрабіць некалькі вартых увагі высноў. За паўтары года пазіцыя Багдана Хмяль-

[3] С. Пазняк, *Дэулінскае перамір'е 1618*, [у:] *Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя ў 2-х тамах*, т. 1. Мінск 2005, с. 614; В. Варонін, *Невель*, [у:] *Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя ў 2-х тамах*, т. 2, Мінск 2006, с. 353.

ніцкага адносна ВКЛ змянілася ад спробы наладзіць кааліцыю супроць Кароны Польскай да поўнага захопу дзяржавы (з вясны 1649 г.). Аўтар артыкула таксама пераканаўча аспрэчвае меркаванне, якое замацавалася ў польскай гістарыяграфіі аб існаванні ў пачатку 1649 г. плана супрацоўніцтва паміж князем трансільванскім Дз'ердзем II Ракаці, вялікім гетманам ВКЛ Янушам Радзівілам і Багданам Хмяльніцкім, накіраванага супроць Польшчы. Яшчэ адна выснова ўкраінскага даследчыка сцвярджае, што Януш Радзівіл быў адным з самых бескампрамісных змагароў з казацкімі атрадамі на тэрыторыі Беларусі.

Англійскі даследчык Морын Перы (Бірмінгем) свой артыкул *Богдан Хмельницкий и вопрос о выдаче Московскому правительству самозванца Тимофея Анкудинова (1650 г.)* прысвяціў аднаму прыватнаму эпізоду расейска-казацкіх узаемаадносін у сярэдзіне XVII ст. і дыпламатычным спробам яго вырашыць. Беларускага чытача павінна зацікавіць адна псіхагістарычная праблема: чаму Расея з канца XVI ст. бесперапынна нараджала разнастайных самазванцаў, чаго мы не сустракаем у межах РП? Адказ хутчэй за ўсё ляжыць у сутнасці і рэаліях функцыянавання дзяржаўна-прававых норм абедзвюх дзяржаў — у дэмакратычным ладзе РП і тыраніі Маскоўскага царства. У гэтым месцы варта адзначыць новыя даследаванні праблемы „самазванства" ў Расеі ў Англіі і ЗША: M. Perrie, *Pretenders and Popular Monarchism in Early Modern Russia: the False Tsars of the Time of Troubles* (Cambridge 1997) і C. S. L. Dunning, *Russia's First Civil War: the Time of Troubles and the Founding of the Romanov Dynasty* (University Park, Pennsylvania, 2001).

Наступны текст Уладзіміра Газына (Камянец-Падольскі) *Литовська елита миж Швецією, Московською державою, Польщею та Казацькою Україною в середині 50-х рр. XVII ст.* гэта артыкул кампілятыўнага характару, напісаны пераважна на падставе некалькіх кніг украінскіх (В. Гарадець, Я. Федарук, Т. Чухліб) і расейскіх (Л. Забароўскі, Э. Кобзарава) даследчыкаў, прысвечаны дыпламатычным спробам літоўскай шляхты аблегчыць свой лёс у самы складаны і цяжкі перыяд уласнай гісторыі. Насельніцтва ВКЛ у сярэдзіне XVII ст. апынулася паміж маскоўскімі, шведскімі і казацкімі акупантамі, з амаль недзеяздольнай каралеўскай уладай. Таму не дзіва, што шляхта шукала для сябе выратавання рознымі спосабамі ў кожнага з агрэсараў. Частка, разам з Янушам Радзівілам, спадзявалася на Швецыю, іншыя, разам з Паўлам Сапегай, захавалі вернасць і надзею на караля Рэчы Паспалітай. Некаторыя спадзяваліся на маскоўскага цара (ашмянская шляхта на чале са сваім старастай Адамам Саковічам), а пінская шляхта звярталася да Багдана Хмяльніцкага. Як адзначалася раней, для беларускага чытача, часам дзіўным падаюцца пэўныя нарацыйныя моманты ў тэкстах украінскіх даследчыкаў. І гэтым разам, Ул. Газын сцвярджае, што „ў Літ-

ве пражывала багата ўкраінскага насельніцтва”, таму адносіны паміж літоўцамі і ўкраінцамі былі даволі „сяброўскія”, што спрыяла жаданню Багдана Хмяльніцкага пашырыць сваю юрысдыкцыю на некаторыя тэрыторыі ВКЛ. Таксама здзіўляе адсутнасць у артыкуле прац і высноў польскіх, беларускіх і літоўскіх даследчыкаў.

Падраздзел „Сацыяльна-эканамічныя адносіны” пачынаецца тэкстам Міколы Пятрова (Камянец-Падольскі) *Кам'янець-Подільський — політико-адміністративний, оборонний, містобудівний та економічний центр Подільської землі у складі Великого Князивства Литовського (60-90-і рр. XIV ст.)*. Прысвечаны ён знакаваму для ўкраінцаў і палякаў гораду. Аўтар змог пераканаўча паказаць, што галоўнай спецыфічнасцю Падольскага рэгіёна з'яўляецца памежнасць. Ад самых пачаткаў знаходжання ў складзе ВКЛ пад панаваннем Карыятавічаў, дадзеныя землі і іх цэнтр Камянец спалучалі ў сабе мясцовыя традыцыі і заходнееўрапейскія навацыі — магдэбургскае права 1374 г. і перапланіроўка прасторавай кампазіцыі горада, развіты гандаль і рамяство, поліканфесійнасць і полікультурнасць, уласная манета. Натуральна, падобныя ўнутраныя і вонкавыя абставіны спрыялі пэўнай незалежнасці Падолля ў знешняй палітыцы.

Андрэй Блануца (Кіеў) у сваім артыкуле *Великокнязивська політика земельних надань на українських землях Великого Князівства Литовського у другій половині XV ст. (за матеріалами Литовської Метрики)* вельмі скрупулёзна фіксуе наданні альбо пацвярджэнні Казіміра Ягелончыка для шляхты на ўкраінскіх землях. Агулам ён выявіў каля 150 дакументаў. Найбольшая колькасць датычылася Валыні (каля 80 дакументаў), дзе надаваліся як асвоеныя землі, так і неасвоеныя (своеасаблівы дзяржаўны зямельны рэзерв). Актыўным быў гаспадар таксама ў рэгіёнах памежных з Масковіяй і татарскімі ханствамі — Севершчына, Чарнігаўшчына, Браншчына і Брацлаўшчына. Даследчык заўважае, што найменш вялікі князь літоўскі Казімір у сваёй зямельнай палітыцы звяртаў увагу на Кіеўшчыну. Усе княжацкія наданні адбываліся пры ўмове выканання земскай і вайсковай службы.

Мытная служба спрадвеку з'яўлялася важнай дзяржаўнай інстытуцыяй. На матэрыялах ВКЛ гэта чарговы раз абгрунтавана і пераканаўча асвятліла Ларыса Жарабцова (Днепрапятроўск) у артыкуле *Структура таможенной службы Великого Княжества Литовского в конце XV — середине XVI вв.* Крыніцазнаўчай базай сталі матэрыялы Літоўскай Метрыкі за акрэслены перыяд. Даследчыца выявіла 414 дакументаў, якія датычацца фармавання, функцыянавання і зместу мытнай сістэмы Княства на ўкраінскіх землях. Нягледзячы на гэтае тэрытарыяльнае абмежаванне аўтару ўдалося выразна паказаць складанасць мытнай службы і разнастайнасць мытных пошлін у ВКЛ, што адлюстроўва-

ла пераходны характар гаспадарчай сістэмы ад сярэднявечных правіл да рынкавых ранняга новага часу. Вельмі карысным для даследчыкаў будзе дадатак у канцы тэксту, у якім змешчаны змест (а значыць функцыі) 42 мытных пошлін, якія выкарыстоўваліся на ўкраінскіх землях ВКЛ. Цяпер мусім дачакацца падобнага даследавання адносна беларускіх і літоўскіх зямель, каб пазней была магчымасць напісання сінтэтычнай нарацыі аб мыце Вялікага Княства Літоўскага да ўтварэння Рэчы Паспалітай.

У тэксце Уладзіслава Бяркоўскага (Кіеў) *До питання експорту товарів з Волині в XV — перщій половині XVII ст. Торгивля воском та худобою* асветлены працэс фармавання Валыні са значнага пасрэдніка ў гандлі паміж Усходам, Поўднем і Захадам да актыўнага ўдзельніка гэтага працэсу. За падставы ўзятыя гандаль воскам і хатняй жывёлай (валы, коні і авечкі). Лічбы, кантакты і маршруты, прыведзеныя аўтарам, уражваюць. Напрыклад, гандлёвае прадпрыемства шатландскага купца Самуэля Эдвардса ў траўні-чэрвені 1647 г. з Валыні да Гданьска вывезла больш за 2000 камянёў воску. Альбо ў 1522 г. астрожскія жыды перагналі ў Польшчу і далей на Захад больш за 1500 валоў. Аднак у гандлі з Валыні, як і ўсяго ВКЛ, у экспарце дамінавалі спажывецкія тавары, паўфабрыкаты і жывёла, калі ў той час імпартавалі гатовыя вырабы.

Раздзел „Гістарыяграфічныя росшукі" прадстаўлены двума тэкстамі. Алег Дзячок (Днепрапятроўск) у артыкуле *Право Великого Князівства Литовського та українських земель у його складі на сторінках українських юридичних видань (1991-2007 рр.)* зрабіў гістарыяграфічны аналіз вынікаў спецыялізаваных даследаванняў гісторыкаў права. Нават абмежаваўшыся перыядычным друкам за апошнія 16 гадоў, аўтар паказаў значныя дасягненні ў гэтай галіне навукі ў нашых паўднёвых суседзяў. Колькасць і якасць тэкстаў уражвае (у параўнанні з беларускай сітуацыяй). Шмат увагі ўкраінскія гісторыкі права надаюць праблемам уплываў права Кіеўскай Русі на Літоўскія Статуты, а іх на ўкраінскае права. Сярод важнейшых заўваг А. Дзячок адзначае рэгіянальнасць даследаванняў (яны абмяжоўваюцца толькі ўкраінскімі тэрыторыямі ў складзе ВКЛ), пэўную кампілятыўнасць тэкстаў. Апошні недахоп ён бачыць у вельмі абмежаваным супрацоўніцтве гісторыкаў права з „чыстымі" гісторыкамі, заўважаючы, што першыя часам не чытаюць апошніх.

Вельмі цікавым з'яўляецца артыкул заўчасна памерлай геніяльнай украінскай даследчыцы Наталіі Юсавай (Кіеў) *Миркування Мирона Кордуби стосовно часу и обставин утворення української народності*. У ім разглядаюцца погляды малавядомага беларускаму чытачу ўкраінскага гісторыка, прафесара Варшаўскага ўніверсітэта ў 20-30-х гадах XX ст.

на проблему пачаткаў нацыягенезісу нашых паўднёвых суседзяў. Адным з важнейшых пастулатаў М. Кардубы было прызнанне існавання „агульнарускай культурнай сферы" ў часы Кіеўскай Русі. Менавіта ў гэтай сферы заклаліся пачаткі ўкраінцаў і беларусаў. Больш таго, ад сярэдзіны XIII ст. да часоў Вітаўта на думку М. Кардубы існавала супольная ўкраінска-беларуская нацыя ў межах ВКЛ. Менавіта з XIV ст. у працэсе падзелу гэтай супольнасці паўстае ўкраінскі народ, а значыць і беларускі народ. Погляды М. Кардубы выклікалі адмоўную рэакцыю з боку ўкраінскіх нацыянальных навукоўцаў аб'яднаных ва Украінскім гістарычна-філалагічным таварыстве ў Празе, для якіх гісторыя ўкраінскага народа пачыналася з часоў Кіеўскай Русі. Усе нюансы дыскусіі аб пачатках і абставінах фармавання ўкраінскага народа ў канцы 20-30-х гадоў XX ст. чытач знойдзе ў артыкуле Наталіі Юсавай.

Завяршае першы том новага ўкраінскага выдання ***Ukraina Lithuanica*** раздзел „Рэцензіі і агляды", дзе змешчаны два тэксты. У адным Андрэй Блануца разглядае першыя тры выпускі беларускага выдання „Metricana. Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага" (рэдактар Алег Дзярновіч). Другі тэкст — рэцэнзія Міраслава Валашчука на кнігу венгерскай даследчыцы Марты Фонт „Каралі дынастыі Арпадаў і князі Рурыкавічы".

**Генадзь Семянчук**
(Гродна)

## **Андрэй Унучак, *„Наша Ніва" і беларускі нацыянальны рух (1906-1915 гг.)*, Мінск: Беларуская навука, 2008, 186 с.**

„Наша ніва" — ці не адзіны рэалізаваны праект беларускага нацыянальнага руху, які мае ўстойлівую марку якасці, праверануто часам і выпрабаваннямі. Мяркуйце самі. Цэлы перыяд у літаратуры ў пачатку XX ст. названы „нашаніўскім". Рэдакцыя газеты стала цэнтрам гуртавання не толькі інтэлектуальных, але і палітычных сіл беларускага руху, і гэта прызнаецца гісторыкамі розных гістарыяграфічных накірункаў. Рэха ад выдання „першай беларускай газеты з рысункамі" стала настолькі моцным, што ў канцы XX ст., на хвалі новага адраджэння, інтэлектуал Сяргей Дубавец адразу аднавіў гэты праект, і не так даўно беларускае грамадства адзначала 100-годдзе „Нашай Нівы". І сёння многія беларускія дзеячы арыентуюцца на тое выданне, спрабуючы стварыць нешта падобнае.

Дзякуючы „Нашай Ніве" беларускі рух ведаюць ва ўсім свеце. „Наша Ніва" сапраўды стаяла ў пачатку **ЎСЯГО**. Гэта пасля з'явіліся і БНР, і БССР, і адбылася сучасная РБ. А ўсё пачыналася з таго, што ў адзін дзень у Вільні, у памяшканні па вуліцы Завальнай, сабралася некалькі чалавек, якія цвёрда вырашылі пачаць вельмі складаную справу — абуджэння і адраджэння народа, што меў слаўнае мінулае, але цьмяную сучаснасць. Пачаць праз выдаванне першай у свеце беларускамоўнай газеты.

Каб пераканацца ва ўсім гэтым, дастаткова прачытаць манаграфію Андрэя Унучка *„Наша Ніва" і беларускі нацыянальны рух (1906-1915 г.г.)*. Што адразу ўражвае ў кнізе — гэта падрабязны агляд крыніц і літаратуры. Аўтар пералічвае імёны ўсіх даследчыкаў і аналізуе ўсе артыкулы, у якіх прама ці ўскосна ўпаміналася і распрацоўвалася тэматыка „Нашай Нівы". Ім разглядаецца перыяд савецкай гістарыяграфіі ад шальмавання і абвінавачванняў выдаўцоў газеты ў нацыянал-дэмакратызме ў 1930-я гады да спроб паступовай рэабілітацыі газеты ў 1960-я, а таксама сучасная беларуская гістарыяграфія. Пры гэтым аўтар пазбягае паспешлівых і рэзкіх ацэнак у адносінах да тых, хто пісаў пра „Нашу Ніву".

У сваім даследаванні А. Унучак прыходзіць да парадаксальных высноў. Нягледзячы на тое, што пра першую беларускамоўную газету было напісана шмат артыкулаў, яна ўзгадваецца ва ўсіх падручніках па гісторыі і літаратуры дадзенага перыяду, але яшчэ не было праведзена ніводнага комплекснага даследавання і аналізу публіцыстыкі „Нашай нівы": „Як гістарычная крыніца газета выкарыстоўвалася недастаткова. Недастаткова даследаваны ўплыў „нашаніўскай" публіцыстыкі на

станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі, не дадзена ацэнка гэтаму ўплыву. Таму паўстае шмат пытанняў, на якія можа быць дадзены адказ толькі зыходзячы са шматбаковага аналізу зместу газеты. Толькі пасля таго, як гэта будзе зроблена, мы можам сказаць, што „Наша Ніва" і „нашаніўства" засвоены беларускай гістарычнай навукай" (с. 20). Магчыма, што ў беларускай гістарычнай навуцы проста не выпрацаваны крытэрыі ацэнкі, з якімі трэба падыходзіць да першай беларускамоўнай газеты. Сапраўды, „Наша Ніва" — больш, чым проста газета. Гэта цэлы феномен — культурны, гістарычны, палітычны. Феномен развіцця беларускай нацыі, яго асаблівасць. Андрэй Унучак у сваім даследаванні, можа быць упершыню ў гістарычнай навуцы, спрабуе падысці да гэтага феномена з нейкай сістэмнасцю.

Мінскі гісторык разглядае „Нашу Ніву" ў двух кантэкстах. Першы (але не асноўны) — сацыяльна-палітычны кантэкст. А. Унучак даследуе яго праз прызму вывучэння сялянскай тэматыкі — жыцця тых, для каго, уласна, і выдавалася газета. Заснавальнікі „Нашай Нівы" лічылі сялян асноўнай рухаючай сілай будучага беларускага адраджэння. Менавіта на абуджэнне іх свядомасці была скіравана ўся дзейнасць братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Аляксандра Уласава і інш. А.Унучак падзяляе думку Сяргея Токця, даследчыка жыцця беларускага сялянства ў XIX-XX стст., што яно мела адносна нізкую нацыянальную самасвядомасць, і выкарыстоўвае аносна яго азначэння тэрмін, уведзены С. Токцем — „лакальная супольнасць". А. Унучак прыводзіць словы гарадзенскага даследчыка: „Галоўная праблема палягала ў тым, што традыцыйная сялянская культура не мела ўнутранага механізму, які б падштурхоўваў сялян і стымуляваў працэс іх інтэграцыі ў нацыянальную супольнасць" (с. 44). У такой сітуацыі толькі з'яўленне нацыянальнай прэсы магло прымусіць селяніна думаць абстрактнымі для яго катэгорыямі народа, паказаць, што гэты народ мае канкрэтную акрэсленую тэрыторыю, дзе жывуць такія ж самыя беларусы.

Сялянская тэматыка сапраўды была вельмі шырока асветленая на старонках газеты. Там знайшлі адлюстраванне практычна ўсе праблемы, якія хвалявалі селяніна. „Наша Ніва" падрабязна асвятляла выбары ў Дзяржаўную Думу Расійскай імперыі, намагаючыся схіліць сялян да выбрання туды ўласных прадстаўнікоў, а не тых, каго выставяць царскія ўлады. Дзейнасць дэпутатаў таксама аналізавалася газетаю. Нашаніўцы пісалі аб тым, хто з дэпутатаў Думы адстойвае інтарэсы сялян, якія законапраекты там прымаюцца і г.д. Можна сцвярджаць, што газета старалася даць беларусам першапачатковую палітычную адукацыю, каб яны маглі арыентавацца ў існуючых варунках сацыяльна-палітычнага развіцця. Але тут усе намаганні — і гэта прызнаюць самі выдаўцы газеты — пацярпелі крах. Менавіта беларускае сялянства бы-

ло асноўным „пастаўшчыком” у Думу прадстаўнікоў чарнасоценных і крайне правых партый. Праблема была ў той жа нізкай самасвядомасці, і „праламаць сцяну” ў гэтым кірунку нашаніўцы не здолелі.

Акрамя дзейнасці Думы газета пісала пра сялянскую гаспадарку, часта закранаючы зямельнае пытанне, за што на некалькі яе нумароў быў накладзены арышт; пра найбольш якасныя формы гаспадарання, выступаючы за актыўную сялянскую кааперацыю; пра адукацыю для сялян, адкрыццё школ і бібліятэк, пра культуру; пра эміграцыю ў Амерыку і тое, які ўплыў аказвае гэтая з’ява на эканоміку краю; пра гандаль, прамысловасць, транспарт, банкаўскую сістэму і шмат чаго іншага. Тэматыку насамрэч можна пералічваць у бясконцасць. Усё гэта Андрэй Унучак і называе праграмаю рэформ, якую распрацавала „Наша Ніва”, і з ім цяжка не пагадзіцца. У газетных артыкулах Аляксандра Уласава, братоў Луцкевічаў, Вацлава Іваноўскага, Вацлава Ластоўскага быў закладзены падмурак беларускага дзяржаўнага будаўніцтва, які пасля з рознай доляй поспеху выкарыстоўвалі розныя палітычныя сілы.

Але сацыяльная тэматыка, як вынікае з даследавання, — не асноўная. Андрэй Унучак даводзіць, што менавіта нашаніўцы дакладна сфармулявалі і распрацавалі беларускую нацыянальную ідэю. „Кожны нацыянальны рух пачынаецца з ідэі, якую бярэ на ўзбраенне невялікая група людзей, якія абвяшчаюць, што маюць адказ на галоўную праблему той ці іншай эпохі ў жыцці народа” (с. 61). Такую самую ідэю і ўзялі на ўзбраенне нашаніўцы, ставячы сабе задачу *стварыць* беларускі нацыянальны рух. Але кожны рух складаецца з людзей, якіх трэба прыцягнуць да ўдзелу ў справе нацыянальнага будаўніцтва. І вось з гэтага ўжо вынікае канкрэтная мэта выдаўцоў першай беларускамоўнай газеты — *стварыць* нацыянальную інтэлігенцыю. Таму беларуская інтэлігенцыя — вельмі малалікая, ідэйна кволая, яшчэ толькі-толькі ўзнікшая — і была другім адрасатам, пасля сялянства, да якога звярталася „Наша Ніва”. Увесь час газета старалася прыцягнуць да супрацоўніцтва як мага большую колькасць людзей, пашырыць кола інтэлігенцыі, а таксама сфарміраваць яе ідэйна. Вось чаго дабівалася „Наша Ніва” на працягу усяго свайго існавання, бо яе выдаўцы выдатна разумелі, што інтэлігенцыя — гэта кузня кадраў нацыянальнага руху. Яны распрацавалі праграму-мінімум для яе: стварыць беларускую адукацыю і ўводзіць беларускую мову ў школах. Як вынікае з гэтага, асноўныя сілы беларуская інтэлігенцыя павінна была чэрпаць з настаўніцкіх кадраў, і прыклад з Якубам Коласам пацвярджае гэта. Андрэй Унучак таксама адзначае змаганне з боку газеты за інтэлігенцыю з польскім рэгіяналізмам і заходнерусізмам.

Аўтар даследавання разглядае не толькі дзейнасць „Нашай Нівы”,

але і беларускі нацыянальны рух у цэлым, перыяды яго станаўлення да выхаду газеты. Усё дзеля таго, каб давесці, што „сваю мэту і місію ідэолагі газеты бачылі ў распрацоўцы нацыянальнай ідэі" (с. 90). Выдаўцы „Нашай Нівы" выдатна разумелі, што яны кіруюць працэсам нацыянальнага адраджэння, ці, інакш кажучы, „робяць гісторыю". Але цяжар адказнасці ніколі не згінаў іх плячэй, не збіў з правільнага шляху. Менавіта ў гэтым і заключалася прычына поспеху газеты — у паслядоўнасці ідэйнай лініі і ў вялікай ахвярнасці і мэтанакіраванасці рэдакцыі, што дае падставы А. Унучку рэзюмаваць: „(...) на 1915 год асноўныя тэарэтычныя падмуркі беларускай нацыянальнай ідэі былі сфарміраваныя і распрацаваныя" (с. 113). Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прывесці адзін невялікі прыклад, скажам, з гістарычнай навукі: менавіта выдаўцы „Нашай Нівы" на чале з Вацлавам Ластоўскім і яго *Кароткай гісторыяй Беларусі* сталі заснавальнікамі гістарычнай парадыгмы перыяду Вялікага Княства Літоўскага, як „залатога веку" для развіцця беларускіх зямель, якая ўжо стала замацавалася ў галовах не толькі навукоўцаў, але і простых беларусаў. А гэта толькі гістарычная навука і толькі адна з яе канцэпцый. А калі ўзяць іншыя галіны навукі, культуры, эканомікі, палітыкі, ці любой іншай сферы жыцця? Усюды можна знайсці сляды гэтага самага феномена „Нашай Нівы", на распрацоўку якога так шмат сіл паклалі выдаўцы першай беларускамоўнай газеты...

Асобна ў манаграфіі даследчык выдзяляе два моманты з гісторыі дзейнасці „першай беларускай газеты з рысункамі": яе арганізацыйную справу і супрацьстаянне з заходнерусізмам і польскім нацыяналізмам. Унучак палемізуе з Юрыем Туронкам у пытанні таго, каму належала ініцыятыва ў стварэнні „Нашай Долі" — папярэдніцы „Нашай Нівы". Польска-беларускі гісторык выказаў меркаванне, што тут першасную ролю адыгралі Францішак Умястоўскі і Іван Тукеркес, а браты Луцкевічы пазней імкнуліся пераняць кіраўніцтва газетаю. Але Андрэй Унучак прапануе параўнаць „ступень заангажаванасці Луцкевічаў і Тукеркеса з Умястоўскім у нацыянальны рух" (с. 27), а таксама спасылаецца на падобную думку, выказаную Алесем Кавалём [Аляксеем Каўкам — рэд.] у тыднёвіку „Ніва" ў 1981 г. Аўтар аналізуе склад супрацоўнікаў і карэспандэнтаў газеты, пытанне нагляду за „Нашай Нівай" з боку Дэпартамента духоўных спраў Расійскай імперыі і Галоўнай Управы ў справах друку, рознасць поглядаў паміж „этнічным нацыяналістам Вацлавам Ластоўскім і прыхільнікам „краёвай ідэалогіі" Антонам Луцкевічам" (с. 120), якая пазней прывяла да расколу ўсяго беларускага руху.

Андрэй Унучак таксама пералічвае крыніцы фінансавання газеты. Ён адразу адкідвае тэзіс, што газета выдавалася за кошт Польскай пар-

тыі сацыялістычнай, які меў хаджэнне ў беларускай савецкай гістарыяграфіі, нават асабліва не палемізуючы з гэтым. Аўтар сцвярджае, што газета ўтрымлівалася за кошт грошай, якія атрымліваў Іван Луцкевіч пасля продажу антыкварыяту, якому дапамагалі Зыгмунт Нагродскі і Галляш Леўчык, а таксама часткова фінансавалася за кошт рэкламы. У 1912 г. чэк на 20 тысяч рублёў передала рэдакцыі княгіня Магдалена Радзівіл. Але гэта было толькі аднаразавае ахвяраванне і таму, на мой погляд, не варта перабольшваць значэнне асобы княгіні Радзівіл у беларускім нацыянальным руху, што робіцца апошнім часам у айчыннай гістарыяграфіі. Таксама газету час ад часу матэрыяльна падтрымлівалі „абшарнікі з краёвай свядомасцю" Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч, а Марцін Кухта часам друкаваў „Нашу Ніву" ў крэдыт.

Аналізуючы ідэйнае супрацьстаянне „Нашай Нівы" з заходнерусізмам і польскім нацыяналізмам, Андрэй Унучак шырока даследуе гэтыя з'явы ў беларускім грамадскім жыцці — асабліва заходнерусізм на чале з Іванам Саланевічам і яго «Белорусским обществом» — разглядае іх вытокі, станаўленне, ідэйную размежаванасць і паступовы сыход з гістарычнай арэны. Таму манаграфія можа быць карысная ў якасці даследавання дадзенай праблематыкі. У кнізе змяшчаецца таксама багаты архіўны матэрыял, у асноўным дакументы Галоўнай Управы па справах друку, якія дапамагаюць нам зразумець і адчуць умовы, у якіх працавалі стваральнікі першай беларускамоўнай газеты.

Лозунг нашаніўцаў гучаў: „Не будзем пісаць громка. Будзем спакойна, цвёрда кідаць усім праўду ў вочы, пастараемся быць справядлівымі і панаваць над сабою: няхай халодны розум трымае ў сваіх руках гарачае сэрца". Ці не праўда, вельмі актуальна гучаць гэтыя словы і праз сто гадоў...

**Дзмітры Краснапеўцаў**
(Гудзевічы — Гродна)